**В.І. Еўмянькоў *(Магілёў)***

# "ЛІРНЫЯ СПЕВЫ" М. ГАРЭЦКАГА

Напісаны ў 1914 годзе і выдадзены Беларускім выдавецтвам у Вільні зборнік "Рунь" адразу ж звярнуў на сябе ўвагу крытыкаў і чытачоў (рэцэнзія ў "Нашай Ніве", згадка ў артыкуле Максіма Багдановіча "Беларускае адраджэнне" (1914 г.)).



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Але залішняя ў некаторых выпадках увага, звернутая на ідэйны бок зборніка, не дазволіла заўважыць асаблівасці сюжэтна-кампазіцыйнага і жанравага характару. "Рунь" складаецца з 10 генетычна роднасных частак. Гэта не простая сукупнасць выпадкова аб'яднаных нагодай зборніка твораў, існаваўшых на той час. У якасці доказу прыводзім наступныя высновы.

У апавяданнях дзейнічаюць тры асноўныя вобразы, якія, быццам вопратку, змяняюць уласныя імёны, захоўваючы змест. Напаўненне іх мадэфікуецца, аўтар распрацоўвае магчымыя сцэнарыі развіцця аднаго і таго ж у дадзенай канкрэтнай сітуацыі. А таму розныя сюжэты апавяданняў ёсць толькі розныя формы, спраецыраваныя магчымасці. Маецца на ўвазе:

а) вобраз інтэлігента, вясковага хлопца, які "запанеў";

б) апазіцыя інтэлігенту – вобраз простага люду;

в) вобраз трэццяй асобы (голас "родных карэньняў").

У апавяданні "Рунь" даецца імпульс для развіцця вобраза інтэлігента. З'яўляецца асоба Уладзіміра З. ("…Быў ён сірата, матка памёрла дужа рана…") Просты хлопец выбіваецца з уласнага асяроддзя, асвятляецца навукай. Плата за навуку досыць жорсткая: з аднаго боку, мадрыгальнае становішча ("прымач у панстве і пасынак вёскі"); з другога боку – сэрца разрываецца ад праклятых пытанняў ("хвароба інтэлегента"). Уладзімір З., Клім Шамоўскі, Архіп Лінкевіч, Касцюк Зарэмба – імёны адной і той жа індывідуальнасці, спосабу паводзін, светапогляду. Але, калі вобраз Уладзіміра З. – гэта толькі імпульс, своеасаблівае сфуматта, то ў астатніх выпадках дзейнічае закон развіцця і пашырэння ўжо вымаляваных якасцяў.

Той жа Уладзімір З. кажа: " Ты, Уладзька, сын народу!", але з другога боку дадае: " Людзі капашацца…Я вышэй гляджу!…" З'яўляюцца першыя вобразы народа ( "Бачыў, як хавалі Астапа, што апрогся ад гарэлкі"), і адразу ж паўстае сімвал бруду ("У лазні"), народ параўноўваецца са свіннямі, з бязглуздай зграяй, бруд вакол якіх – гэта і ёсць стан душы нацыі. Беларусы захлынаюцца ў атруце, якая пазбаўляе іх нават жадання жыць лепей, і справа тут не толькі і не столькі у гарэлцы. Гарэцкі сутыкаецца з праблемай, якую ў 80-х Айтматаў азначыў тэрмінам "манкуртства": забыліся на карані – і ператварыліся у жывёл, памёрлі як людзі, зніклі як нацыя. І што можа адзіны сярод статку манкуртаў? Уладзімір З. : " Беларуская справа…Што я магу? І што хто можыць?" Жыць далей у брудзе: што значыць лічыць сябе тутэйшым, ганьбіць чалавечую годнасць рабскай пакорлівасцю, не мець перспектывы на далейшае развіццё – усё гэта не мажліва для інтэлігента, але жадаючы жыць па-чалавечы, той жа Клім Шамоўскі ("У лазні") толькі павялічвае дыстанцыю паміж сабой і народам ("…а запанеў наш каморнік"). Так, менавіта "запанеў", і на яго спробу чытаць вершы Я. Коласа аднавяскоўцы глядзяць са здзіўленнем і нават з засцярогай; у іх вачах Клім Шамоўскі – блазань, дурны паніч, "ня родны, ня свой".



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Згодна з тэорыяй І. Бродскага, кожны народ мае генетычны калектыўны розум, які існуе на падсвядомым узроўні і адбіваецца ў кожнай кроплі жыцця простага чалавека. Функцыя прарока – падслухаць гэтае сэрцабіццё нацыі, адшукаць яго ў касмічнай прасторы, намацаць яго сярод цемрадзі і галечы, адшукаць здаровы пачатак сярод п'янства і забабонаў, сярод бруду і рабства. Менавіта таму з'яўляецца вобраз трэццяй асобы, якая паўстае паміж апазіцыйнымі часткамі інтэлігент – народ і пэўным чынам іх паядноўвае. Гэта голас родных карэнняў, сівой даўніны, "праўды жыцця", якая хаваецца ў словах простага селяніна: " ...Чытай у кніжках і ў разумных людзей пытайся, як жылі даўней нашы тутэйшыя людзі...часцей у роднае гняздзечка залетай, дык ня будзіць яно здавацца табе страшным і не пабяжыш ты ўцякаць ад яго... " ("Роднае карэньня").Не здрадзіць свайму люду, не пазбыцца роднага - гэта галоўнае для інтэлігента, адшукаць у брудзе здаровы пачатак – яго прызначэнне. Звернемся да апавядання "Лірныя спевы". Пачатак яго – урывак з рукапісу Уладзіміра З. пад назвай "Княгіня". Зноў падаецца імпульс для развіцця сюжэту, эмацыянальны абразок, фотаздымак душэўнага стану, сфуматта: "І ня спіцца княгіні,- адзінотка ж яна. Непрыхільна сэрцу ў ціхамірным, а пустым пакою..."У "Лірных спевах" Гарэцкі псіхалагічна і гістарычна растлумачвае праблему манкуртства беларусаў. Прадала княгіня Бацькаўшчыну чужынцам за ўяўнае каханне, здрадзіла народу, перакрэсліла будучыню беларусаў, кінуўшы іх у багну "безканечнай маскоўшчыны". Але гэтая гістарычная здрада яшчэ не ёсць сапраўднае манкуртства. Янка, што пашкадаваў здань беднай княгіні, пакаранай за здраду Панам Богам, зрабіўся "праклятым". Бо прабачыць здрадзе – гэта значыць замірыцца з яе наступствамі, скарыцца, зрабіцца часткай "безканечнай маскоўшчыны". Па сутнасці, Гарэцкі дае адказ на пытанне, як з мацнейшай у Еўропе дзяржавы беларусы ператварыліся ў тутэйшых.

Як бачна, часткі ксёнжкі "Рунь" яднаюцца нават сюжэтамі. Напрыклад, вобраз войта з апавядання Уладзіміра З. з'яўляецца ў "Родных карэньнях"("а была там свежая магіла: надоечы пан войт памёр"); вобраз габрэйкі з апавядання "Красаваў язьмін" з'яўляецца ў апавяданні "У чым яго крыўда". Той Астап, што апрогся ад гарэлкі, падобны на героя абразка "Атрута".

Вельмі цікавым з'яўляецца дачыненне пытання жанру да агульнай канцэпцыі ксёнжкі "Рунь", а дакладней розных мадыфікацый жанру апавядальная гісторыя. І ў прыватнасці, маецца на ўвазе абразок. Калі ўзяць пад увагу азначэнне абразка як стварэння нечага традыцыйнага (практычна нязменнага), то мажліва зразумець, чаму героем абразка "Атрута" зрабіўся менавіта селянін. Жыццё селяніна статычнае, ён пазбаўлены развіцця, жыве па традыцыі, у той час як інтэлігент знаходзіцца заўсёды на разда-



Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

рожжы, ён ніколі не спыняецца, і нават у адну і тую ж хвіліну душу яго разрываюць розныя думкі і пытанні. А таму абразка з яго жыцця зрабіць не мажліва. У дадзеным кантэксце абразок пэўным чынам адлюстроўвае канцэпцыю адносін аўтара да персанажа, мае не толькі формаўтваральны, але і сэнсаваўтваральны пачатак.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова